



**Вольга ВЯРБІЦКАЯ,**
**Аляксандр СМОЛІК**

# Гістарычны дыскурс у творчай спадчыне ЯКУБА КОЛАСА

*Творчая спадчына народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, прадстаўленая яго літаратурнымі творамі і публіцыстычнымі артыкуламі, вельмі разнастайная па сваёй тэматыцы. Немалую ролю ў ёй займаюць пытанні, звязаныя з гісторыяй беларускага народа, адметнасцямі яго культуры.*

Творчае перайманне культурнай спадчыны мінулых пакаленняў з'яўляецца неабходнай умовай для плённага развіцця любой нацыянальнай супольнасці. Важную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае літаратура. Як правіла, яна не замыкаецца ў сваім гістарычным часе, а сэнс літаратурнага твора выходзіць за межы сваёй эпохі. Расійская даследчыца Ю.Крысцева адзначае, што вялікія творы літаратуры падрыхтоўваюцца стагоддзямі, а ў эпоху іх стварэння здымаюцца толькі спелыя плады працяглага і складанага працэсу выспявання[1]. Літаратура выяўляе і ўвасабляе ў мастацкіх вобразах усю разнастайнасць чалавечага быцця, грамадскую свядомасць часу, багацце чалавечых характараў і тыпаў.

Важкі ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускай нацыянальнай літаратуры зрабіў народны паэт Беларусі **Якуб Колас** (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, 1882—1956), 130-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў гэтым годзе. Разам з Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Элаізай Пашкевіч, Змітраком Бядулем, Цішкам Гартным, Максімам Гарэцкім і іншымі пісьменнікамі і паэтамі ён ствараў беларускую класічную літаратуру, беларускую літаратурную мову, распрацоўваў усе асноўныя літаратурныя жанры.

Культуралагічны аналіз літаратурных твораў Якуба Коласа сведчыць пра тое, што яны напоўнены сэнсавымі аб'ектамі, якія перасякаюць самыя розныя



***ВЯРБІЦКАЯ Вольга Іванаўна.*** *Старшы выкладчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У 1993 г. закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага, у 2012 г. — аспірантуру БДУ культуры і мастацтваў. З 2009 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Займаецца даследаваннем творчай спадчыны Якуба Коласа. Аўтар больш за 20 навуковых публікацый.*



***СМОЛІК Аляксандр Іванавіч.*** *Загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар культуралогіі, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1944 г. у в. Каловічы Вілейскага раёна. У 1968 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага, працаваў дацэнтам у гэтым інстытуце, потым дэканам факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. З 1992 г. — прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Аўтар манаграфій "Культура Беларусі XI—XIX стст." (Мн., 1998), "Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме" (Мн., 1999), "Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме" (Мн., 1999), "Гісторыя і культура беларускіх татар" (Мн., 2000; у сааўт. з І.Б.Канапацкім) і інш.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыскурсы. Коласаўскія творы ўключаны ў цэлую сістэму культурных каардынат, ім уласцівы самыя розныя веды: філасофскія, палітычныя, лінгвістычныя, рэлігійныя, сацыялагічныя, педагагічныя, гістарычныя і інш.

Значнае месца ў творчасці паэта займае гістарычны дыскурс, у прыватнасці распрацоўка такой праблемы як *гісторыя і памяць.* З тэкстаў мастацкіх і публіцыстычных твораў Коласа вынікае, што гісторыю ён разумеў як своеасаблівую форму памяці грамадства, якая ў вобразах мінулага так альбо інакш адлюстроўвае сацыяльна-палітычны і духоўны кантэкст свайго часу. На думку пісьменніка, гісторыя, як і літаратура, павінна садзейнічаць фарміраванню і падтрыманню адметнага нацыянальнага характару і адпаведнага псіхалагічнага тыпу асобы. Літаратура і гісторыя як культурны тэкст змяшчае ў сабе сацыякультурны досвед народа, захоўвае яго, ажыццяўляе кадзіраванне і перадачу наступным пакаленням. Ён пісаў: *"Без вывучэння мінулага і сучаснага мы не можам прадбачыць будучага"*[2].

Адным са змястоўна-тэматычных вузлоў творчасці пісьменніка была *праблема культурнай непамятнасці, адсутнасці беларусаў у еўрапейскай гісторыі і культуры.* Даследчыкі адзначаюць, што ў выніку спецыфікі гістарычнага развіцця беларускага этнасу да канца XIX ст. народ і нават большая частка інтэлігенцыі мелі слаба развітую нацыянальную самасвядомасць. Ва ўяўленні еўрапейцаў беларусы паўставалі як нявызначаная народная маса без этнічнай свядомасці і сваёй нацыянальнай ідэі. Адносіны да беларускасці з боку прадстаўнікоў іншых народаў Якуб Колас паказаў у паэме "Рыбакова хата". Адзін з персанажаў паэмы пан Пшэбора (прадстаўнік польскай адміністрацыі ў Заходняй Беларусі) выказаў тыповае меркаванне аб беларускасці наступнымі словамі:

*"Што беларускасць? пыл і дым,*
*І засмучацца няма чым:*
*Няма ў культуры іх карэння"*[3].

Эмацыянальна і безапеляцыйна фармулюе Якуб Колас крыўдны для яго факт непамятнасці ў трылогіі "На ростанях". Галоўны герой твора Андрэй Лабановіч у спрэчцы са сваім калегам Турсевічам з гарыччу разважае: *"Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда зазначае: я — англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца ў тым, што мы — беларусы"*[4]. Менавіта таму неабходна было развеяць думку аб спрадвечнай культурнай адсталасці беларускага народа, аб яго няздольнасці да самастойнага этнанацыянальнага развіцця. Якуб Колас якраз і быў адным з тых дзеячаў, якія імкнуліся абвясціць свету аб існаванні самабытнага беларускага народа як суб'екта багатай духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Аналіз шэрага коласаўскіх твораў паказвае, што нацыянальную гісторыю пісьменнік трактаваў пераважна як спецыфічную форму культурнай памяці, адэкватную задачам фарміравання маштабных ідэнтычнасцей ва ўмовах дзяржаўнага адраджэння. Вобразы гістарычнага мінулага беларускага народа створаны пісьменнікам у артыкулах "Думкі да дванццацігоддзя БССР" (1939 г.), "Шаўчэнка і беларуская паэзія" (1939 г.), "Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии" (1943 г.), "Двадцать пять" (1943 г. )[5], "Что было, что стало" (1947 г ), "Раскрепощённая земля" (1948 г.)[6]. У гэтых і шэрагу іншых публікацый ён нагадвае важ-



*Сяргей Раманаў. Ілюстрацыя да аповесці Якуба Коласа "Дрыгва".*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нейшыя этапы гістарычнага развіцця нашай краіны, імкнецца сцвердзіць старажытнасць беларускага народа, яго дзяржаўнасці і культуры. У артыкуле "Двадцать пять" Якуб Колас раскрывае сутнасць гісторыі беларускага народа: гэта шматвяковая барацьба супраць сацыяльнай несправядлівасці, прыгнятальнікаў і чужаземных захопнікаў[7]. У артыкуле "Шануйце і любіце сваю родную мову" (1947 г.) пісьменнік адзначае, што *"беларускі народ, як і кожны народ, мае сваю багатую гісторыю..."*[8].

У публіцыстычных артыкулах і некаторых мастацкіх творах (трылогія "На ростанях", аповесці "Дрыгва", "Адшчапенец", "На прасторах жыцця") Якубам Коласам паказаны пэўныя значныя гістарычныя перыяды ў развіцці беларускага грамадства. Творца надзяляў канкрэтныя гістарычныя падзеі тым альбо іншым сэнсам. Гістарычны аповяд арганізаваны ім вакол вобразаў прагрэсу, упадку і руху ад упадку да адраджэння. У коласаўскім калектыўным вобразе мінулага можна вылучыць "перыяды-ўзлёты" і "пустыя гістарычныя перыяды", своеасаблівыя "вяршыні" і "нізіны" калектыўнай памяці.

Так, у артыкулах "Двадцать пять" і "Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии" ў якасці "вяршынь" калектыўнай памяці вылучаны часы існавання Полацкага, Віцебскага і іншых старажытных княстваў, эпоха Вялікага Княства Літоўскага і савецкі перыяд. Якуб Колас адзначаў, што на гэтых гістарычных этапах беларускі народ стварыў сваю дзяржаўнасць, забяспечыў поўную незалежнасць, росквіт роднага слова і культуры, *"дал целую плеяду общественных и культурных деятелей, которыми мог бы гордиться каждый народ: Георгий-Франтишек Скорина, Василий Тяпинский, Богушевич, Янка Купала"*[9].

"Пустым гістарычным этапам", па меркаванню Якуба Коласа, з'яўлялася XIX стагоддзе, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай Імперыі. У артыкулах "Беларуская мова ў казённай школе" (1906 г.), "За паўтара дзесятка гадоў" (1934 г.), "Шаўчэнка і беларуская паэзія", у шэрагу мастацкіх твораў пісьменніка пачатку XX ст. Беларусь гэтага часу паўставала безыменнай, беззямельнай, безгалосай, нацыянальна і сацыяльна прыгнечанай. Такімі ж, на думку пісьменніка, былі перыяды знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921—1939 гг.) і акупацыі БССР нямецка-фашысцкімі захопнікамі (1941—1944 гг.). Гэтым гістарычным падзеям Колас прысвяціў дзясяткі публіцыстычных і мастацкіх твораў. У артыкуле "Далоў панскую інквізіцыю" (1932 г.) ён з сумам зазначаў, што ў 1920-я—1930-я гг. у Заходняй Беларусі былі *"загашаны вогнішчы беларускай культуры, ідзе жорсткая каланізацыя зямель беларускага сялянства праз засяленне асаднікаў"*[10]. У змрочных фарбах творца паказвае Беларусь пасля Вялікай Айчыннай вайны: *"Абраблена і разбурана нямецкімі ордамі наша зямля. Руіны і пажарышчы нашых сёл і гарадоў яшчэ значны час будуць без слоў красамоўна гаварыць пра варварства сучасных фашысцкіх гунаў"*[11].

Такім чынам, Якуб Колас узнаўляў у памяці беларусаў найбольш радыкальныя разрывы іх культурна-гістарычнага развіцця, якія пагражалі самому існаванню беларускага грамадства, былі разбуральнымі для яго фундамента. Нямецкі гісторык Й.Рузэн называе такія разрывы культурнай траўмай (катастрафічным крызісам), якая *"разбурае структуру параджэння сэнсу і перашкаджае яе аднаўленню такім чынам, каб яна магла выконваць тыя ж функцыі, што і разбураная"*[12]. Гістарычны дыскурс коласаўскай спадчыны дазваляе гаварыць аб тым, што пісьменнік не абмяжоўваўся толькі паказам культурнай траўмы, але спрабаваў таксама вызначыць стратэгію дэтраўматызацыі і ўзнаўлення цэласнасці ідэнтычнасці беларускай сацыяльнай супольнасці.

У гістарычных наратывах існуюць дзве асноўныя стратэгіі, з дапамогай якіх можна растлумачыць існуючае становішча і ўзнавіць цэласнасць нацыянальнай самасвядомасці: "абгрунтоўваючая" і "контрапрэзентная". Першая паказвае мінулае як асэнсаванае і прымае неабходнасць існуючага парадку рэчаў. Яе прыхільнікі заклікаюць да пакоры, самакрытыкі, выпраўлення памылак і прагматызму. Другая прасякнута адчуваннем недасканаласці і неправамернасці існуючага становішча, зыходзячы з гістарычных заслуг і прызначэння этнасу.

Аналіз мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў Якуба Коласа дазваляе зрабіць выснову, што іх аўтар прытрымліваўся контрапрэзентнай стратэгіі. Прычыны катастрафічнага крызісу ён бачыў ва ўздзеянні знешніх, варожых сіл, а сэнс падзей змяшчаецца ў яго метафізічна-правідэнцыяльную плоскасць. Так, у артыкуле "Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии" ў якасці знешніх варожых сіл называюцца крыжацкія ордэны, французскія захопнікі (1812 г.), кайзераўская армія (1914—1918 гг.), гітлераўскія акупанты (1941—1944 гг.). У шэрагу артыкулаў дэструктыўнымі сіламі названы таксама белапалякі. Напрыклад, у артыкуле "Яны пратэстуюць" (1931 г.) Якуб Колас пісаў: *"Вашы рукі ў братняй крыві, у крыві закатаванага, прыгнечанага панскай дэфензіваю, карнымі экспедыцыямі, пятою Пілсудскага працоўнага люду ў межах Заходняй Беларусі і Украіны"*[13].

Пераносімыя пакуты Колас разглядаў як залог будучых перамог. У артыкуле "Двадцать пять" ён адзначаў, што беларускі народ сваім зоркім вокам і глыбокім розумам бачыў і адчуваў, што ўсе чужаземныя авантурысты бясслаўна зыходзілі са сцэны жыцця, а народ заставаўся вечным і нязломным: *"Жизненный оптимизм, вера в свои силы, в торжество справедливости никогда не покидали белорусский народ, как бы тяжело ни приходилось ему"*[14]. Контрафактычная коласаўская стратэгія арыентавала беларусаў на барацьбу за ўзнаўленне цэласнай нацыянальнай самасвядомасці. У вершах "Ворагам", "Беларусам", "Кіньце смутак", "Наша возьме", "Горкая доля", "Не бядуй", "Мужык" і іншых творах нашаніўскага перыяду паэт заклікаў узняцца на барацьбу за сацыяльную справядлівасць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Васіль Шаранговіч. Партрэт Якуба Коласа.* 1967 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*"Я — мужык, а гонар маю,*
*Гнуся, але да пары.*
*Я маўчу, маўчу, трываю,*
*Але скора загукаю:*
*"Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!"*[15].

У артыкуле "Над чым мы працуем" (1938 г.), дзе пісьменнік пісаў пра паўстанне ў Крычаўскім старостве ў XVIII ст., ён паставіў перад сабой задачу: *"На фоне гэтай гістарычнай абстаноўкі правесці ідэю барацьбы прыгнечанага працоўнага народа за сваё сацыяльнае вызваленне"*[16]. Спробу прасачыць гісторыю сялянскіх паўстанняў у Беларусі пад кіраўніцтвам Няпаліча, Хвясько, Міхненкі, Крывашапкі, Гаркушы, Вашчылы, Каліноўскага пісьменнік зрабіў таксама ў артыкулах "Шаўчэнка і беларуская паэзія", "Двадцать пять". Ідэя барацьбы з польскімі акупантамі пранізвае ўвесь тэкст аповесці "Дрыгва" і шэрага іншых твораў.

Якуб Колас быў перакананы, што захаванне і трансляцыя культурнай памяці немагчыма без наяўнасці прафесійных яе носьбітаў: літаратараў, мас-



*Васіль Шаранговіч. Ілюстрацыі да зборніка твораў Якуба Коласа "З майго летапісу".* 1967 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

такоў, музеязнаўцаў, гісторыкаў, педагогаў. Ён не раз выказваў занепакоенасць, што ў БССР мала рабілася па вывучэнню мінулага і сучаснага. Напрыклад, у "Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі" (1954 г.) ён падкрэсліваў, што *"у нашай гістарычнай навуцы ёсць шмат нявысветленых падзей, напрыклад, шматлікія сялянскія паўстанні ў Беларусі, скажам, пачынаючы з XVIII стагоддзя"*[17]. Пісьменнік заклікаў актывізаваць дзейнасць па збіранню, захоўванню і вывучэнню матэрыялаў аб жыцці народа: *"Без вывучэння мінулага і сучаснага мы не можам прадбачыць будучага. У той жа час мы амаль не дбаем пра тое, каб збіраць, захоўваць і вывучаць матэрыялы аб жыцці народа. Выйшаў у свет новы том матэрыялаў па гісторыі Беларусі. А дзе ж асноўная кніга па гісторыі? Чаму яна не выходзіць у свет?"*[18]. Заклапочанасцю аб гісторыі краіны афарбавана таксама "Прамова на Трэцяй сесіі Акадэміі навук БССР" (1944 г.), у якой пісьменнік канстатаваў, што *"беларускі народ не атрымаў яшчэ з нашых рук свае гісторыі, аповесці аб слаўнай мнагавяковай барацьбе за незалежнасць, за культуру, за сваю нацыянальнасць, за зямлю сваіх продкаў"*[19]. Ён вызначыў наступныя канкрэтныя задачы: *"Напісаць гісторыю свайго народа, запоўніць тыя белыя плямы, якія да сённяшняга дня чакаюць свайго даследчыка... вяр-*



*Георгій Паплаўскі. Ілюстрацыя да паэмы Якуба Коласа "Сымон-музыка".* 1982 г.



*Георгій Паплаўскі. Ілюстрацыя да верша Якуба Коласа "Над магілай партызана".* 1982 г.

*нуць народу яго сыноў, якія бытуюць у памяці не па сваіх пашпартах"*[20].

Якуб Колас быў перакананы, што эфектыўнасць працэсу вывучэння гісторыі беларускага народа ў многім залежыць не толькі ад форм і метадаў навучання, але і ад самога матэрыялу. У сваёй дыдактычнай працы "Методыка роднай мовы" і шэрагу артыкулаў пісьменнік вызначыў наступныя важнейшыя патрабаванні да тэкстаў падручнікаў, у тым ліку і па гісторыі: 1) тэкст падручніка павінен быць цікавым для дзяцей і выклікаць у іх ахвоту да чытання; 2) ён павінен утрымліваць пэўныя і верныя веды; 3) таксама ён павінен *"закранаць у дзяцей лепшыя струны іх, развіваць успагаднасць, гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы. Змест падручніка павінен выхоўваць спачуванне, маральную чуласць"*[21]. Праблему стварэння падручнікаў для школьнікаў пісьменнік не раз уздымаў у сваіх публіцыстычных артыкулах. Так, у артыкуле "Быть гражданином" (1947 г.) Колас, аналізуючы школьную літаратуру, адзначаў, што ў адлюстраванні гісторыі беларускай культуры ёсць шэраг недахопаў. Ён падкрэсліваў: *"Хорошая хрестоматия, в которой умело подобраны наиболее характерные произведения, правильно отражающие развитие белорусской культуры и литературы, — фактор первостепенного значения в воспитании молодого поколения"*[22]. Гэтае ж пытанне пісьменнік ставіў і ў "Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі" (1954 г.). Ён падрэсліваў, што стварэнне падручнікаў *"па гісторыі, геаграфіі і гісторыі літаратуры — задача першарадная"*[23].

Якуб Колас не толькі тэарэтычна абгрунтаваў канцэпцыю школьнага падручніка, але на практыцы зрабіў крокі ў справе падрыхтоўкі падручнікаў. Так, ужо ў 1910 г. было выдадзена "Другое чытанне для дзяцей беларусаў"[24], куды ўвайшлі разнастайныя творы: апавяданні, замалёўкі, нарысы, казкі, вершы, байкі. Ва ўсіх іх шмат дэталей этнаграфічнага характару. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што пісьменнік імкнуўся абудзіць у моладзі гонар за сваю краіну, любоў да роднай мовы. Асноўная ўвага звернута Коласам на працоўную дзейнасць, вытворчы і матэрыяльны побыт беларусаў, аднак знайшлі адлюстраванне таксама народныя звычаі, абрады, адзенне беларусаў.

У сваіх мастацкіх творах пісьменнік таксама імкнуўся адлюстроўваць духоўнае і матэрыяльнае жыццё беларусаў, іх культуру. Ён сцвярджаў, што ў Беларусі захаваліся старадаўнія, часам ледзь не язычніцкія вераванні, уяўленні, светаўспрыманне, якія давалі вытокі амаль усім відам мастацтва. Аналіз шэрага літаратурных твораў Якуба Коласа пераконвае,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што пісьменнік апрацоўваў казкі, легенды, паданні, песні і ўключаў іх у свае паэмы, апавяданні, раманы. Так, насычана легендамі трылогія "На ростанях"[25]. У ёй Колас па-свойму пераказвае біблейскую легенду аб стварэнні Сусвету і ўсяго жывога ў ім. У тэкст трылогіі ўплецена легенда аб з'яўленні на Палессі прыгажунь-дзяўчат. Прысутнічаюць у згаданым творы і гістарычныя легенды. Напрыклад, па-майстэрску перададзены аповяды пра Яшукову гару і Шведскае паленне (падзеі Паўночнай вайны 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі). Адлюстраванне гістарычных паданняў ёсць і ў паэме "Сымон-музыка". Якуб Колас увёў у паэму вобраз Старца ў белым адзенні:

*"Азірнуўся — зноў магілы*
*І пахілыя крыжы,*
*А на прыкладзе драўляным*
*Бачыць — сівенькі дзядок,*
*Дзед Курыла, у бель убраны,*
*Галаву схіліў набок..."*[26].

Вобраз Старца ўзяты з шырока вядомай на Віцебшчыне легенды пра курган-магілу Галубец, з якой уначы выходзіць Старац. Калі наблізіцца да гэтага Старца хоць на пару крокаў, то ён адразу знікае. Тэксты гістарычных легенд уведзены пісьменнікам і ў іншыя творы — апавяданні "Чорт", "У маладых дубах" і г.д.

Значная колькасць мастацкіх твораў Якуба Коласа прысвечана эпахальным гістарычным падзеям XX ст. Так, падзеі першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг., Першай сусветнай вайны 1914—1918 гг. знайшлі адлюстраванне ў апавяданнях "Андрэй выбаршчык", "Соцкі падвёў", "Сіцыліст", "На чыгунцы"; дзяржаўна-культурнае будаўніцтва ў Беларусі шырока паказана ў аповесці "На прасторах жыцця", апавяданнях "Сяргей Карага", "Хаім Рыбас", "Ванька Кудлаты", "Дачакаўся". Шмат публіцыстычных артыкулаў, паэтычных і празаічных мастацкіх твораў напісаны Якубам Коласам на тэму барацьбы беларускага народа супраць акупацыі Польшчай Заходняй Беларусі. Сярод іх неабходна прыгадаць паэму "Рыбакова хата", аповесць "Дрыгва", апавяданне "Хатка над балотцам" і інш. Вялікая Айчынная вайна адлюстравана пісьменнікам у паэмах "Суд у лесе", "Адплата", апавяданнях "Партызан Купрэй", "Сустрэча з ворагам", "У разведцы", "Санітарка Таня", вершах "Вораг не дрэмле", "Шалёнага пса — на ланцуг", "На абарону", "Над магілай партызана", "У цяжкую часіну", "На Захад", публіцыстычных артыкулах "На бітву, браты беларусы", "Злачынцы суда не мінуць", "Здраднікі", "Набліжаецца час расплаты", "Лагерь смерти", "Белорусский народ един" і інш.

Якуб Колас ускладваў вялікія спадзяванні на гісторыка-краязнаўчыя формы працы, з дапамогай якіх можна абуджаць цікавасць да гісторыі. Ён настойліва рэкамендаваў настаўнікам актыўна арганізоўваць экскурсіі. Так, у артыкуле "Задачы савецкай школы" (1948 г.) творца пісаў: *"У інтарэсах асветных і выхаваўчых задач настаўнік мае поўную магчымасць у добрую пагоду выйсці з вучнямі за парог школы, зрабіць экскурсію"*[27]. У сваёй грунтоўнай дыдактычнай працы "Методыка роднай мовы" (1926 г.) пісьменнік выказаў шэраг парад настаўнікам, каб экскурсія дасягнула пастаўленай мэты. Ён адзначыў, што экскурсія *"можа быць звязана з гісторыяй нядаўніх падзей Вялікай Айчыннай вайны, яе героямі, якім так ці іначай давялося тут быць, а часамі і аддаць сваё жыццё за Радзіму, за яе чэсць і незалежнасць"*[28].

На працягу многіх гадоў пісьменнік імкнуўся зацікавіць моладзь краязнаўчай дзейнасцю. Больш за чвэрць стагоддзя ён быў нязменным віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР, адначасова ўзначальваў Фальклорную камісію. Праз яе дзейнасць удалося абудзіць цікавасць да вывучэння фальклору ў настаўнікаў, студэнтаў, прадстаўнікоў і іншых сацыяльных груп. Аб гэтым сведчаць вынікі конкурсу на лепшае збіранне фальклору, які праводзіўся па ініцыятыве Фальклорнай камісіі ў сярэдзіне 1930-х гг. У ім прынялі ўдзел 183 чалавекі — вучні старшых класаў, студэнты, настаўнікі, калгаснікі, рабочыя. Яны даслалі ў камісію 15 тыс. запісаў народна-паэтычнай творчасці. Намаганнямі фальклорнай камісіі штогод арганізоўваліся экспедыцыі з мэтай збірання фальклорных твораў. Толькі ў 1930-я гг. экспедыцыямі, асобнымі збіральнікамі і краязнаўцамі было сабрана каля 80 тыс. фальклорных тэкстаў, 2 тыс. фоназапісаў[29].

Важнейшым тэзісам коласаўскай парадыгмы культурнай памяці з'яўляецца думка аб выключнай ролі этнічнай культуры ў фарміраванні асобы. Якуб Колас пастаянна нагадваў маладым літаратарам, кампазітарам, мастакам, што народ заўсёды выступаў сапраўдным творцам і носьбітам самабытных этнакультурных традыцый, якія ён беражліва захоўваў і клапатліва развіваў, перадаючы з пакалення ў пакаленне. Аб тым, што этнічная культура з'яўляецца ўстойлівай часткай нацыянальнай культуры, дзякуючы якой адбываецца назапашванне і трансляцыя народнага вопыту ў гісторыі, Колас пісаў у артыкулах "Янка Купала і паэзія" (1943 г.), "Двадцать пять"[30], "Что было, что стало", "Культура і навука ў БССР за 30 год" (1957 г.), "Вялікі друг народа" (1955 г.), "Быть гражданином"[31] і інш.

Культурная самабытнасць беларусаў асацыіравалася ў Коласа з фальклорам, які стагоддзямі выпрацоўваў свой нацыянальны стыль. Фальклор здзіўляў і ўражваў народнага паэта Беларусі надзвычайным жанравым багаццем і духоўнай глыбінёй. Колас лічыў, што засваенне вуснай творчасці народа – першасная ўмова для гарманічнага існавання асобы. У артыкуле "Шануйце і любіце сваю родную мову" паэт заклікаў моладзь *"ведаць свой народ, яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць"*[32]. Гэта ідэя з'яўляецца галоўнай і ў трылогіі "На ростанях". Літаратурныя героі мараць падчас канікул павандраваць па Беларусі, сабраць багаты этнаграфічны матэрыял, каб разбурыць стэрэатып аб беднасці беларускай прыроды, культуры. Так, Андрэй Лабановіч кажа: *"У нас столькі прыгоства, столькі багацця форм і фарбаў, і край наш вялікі і разнастайны, а мы не бачым, не хочам гэтага бачыць"*[33].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У артыкулах “Культура і навука ў БССР за 30 год”, “Быть гражданином”, “Что было, что стало” Якуб Колас пісаў, што *“клопат аб народнай творчасці, выяўленне новых талентаў з самой гушчы народа — пачэсная дзяржаўная справа”*[34].

Такім чынам, багатая творчая спадчына, якую пакінуў Якуб Колас нашчадкам, з’яўляецца ў пэўным сэнсе сферай гістарычных ведаў. Для пісьменніка характэрна асаблівае адчуванне сутнасных працэсаў, феноменаў і з’яў гісторыі беларускага народа. Імкненне абудзіць нацыянальны дух і веру народа ў сябе як стваральніка і транслятара высокай духоўнай культуры і багатай гісторыі з’яўляецца той рэфлексійна-пачуццёвай прасторай, вакол якой фарміруецца гістарычны дыскурс твораў пісьменніка. У сваёй творчасці Якуб Колас імкнуўся асэнсаваць вытокі беларускай дзяржаўнасці, спасцігнуць сутнасць нацыянальнага духу, месца і ролю суб’ектаў айчыннай гісторыі ў сусветным грамадскім працэсе. Большасць думак народнага паэта Беларусі адносна кірунку гістарычнага працэсу, сэнсу гісторыі, месца гістарычных ведаў у фарміраванні асобы не толькі не страцілі сваёй значнасці, але яшчэ больш актуалізуюцца ў наш час.

[1] Кристева Ю. Разрушение поэтики // М.М.Бахтин: pro et contra. Творчество и наследие М.М.Бахтина в контексте мировой литературы. Т. II. СПб., 2002. С. 13.

[2] Колас Я. Прамова на XXI з’ездзе Камуністычнай партыі Беларусі // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. Мн., 1976. С. 232.

[3] Колас Я. Рыбакова хата // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 7. Паэмы “Рыбакова хата”, “Суд у лесе”, “Адплата”. Мн., 1974. С. 33.

[4] Колас Я. На ростанях // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 9. Трылогія “На ростанях”. Мн., 1975. С. 82.

[5] Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. Мн., 1976. С. 240—247, 253—267, 301—309, 324—330.

[6] Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 31—33, 43—48.

[7] Колас Я. Двадцать пять // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 325.

[8] Колас Я. Шануйце і любіце сваю родную мову // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 25.

[9] Колас Я. Двадцать пять // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 325.

[10] Колас Я. Далоў панскую інквізіцыю // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 86.

[11] Колас Я. Прамова на VI сесіі Вярхоўнага Савета БССР // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 339.

[12] Рюзен Й. Кризис, травма и идентичность // “Цепь времени”: проблемы исторического сознания / отв. ред. Л.П.Репина. М., 2005. С. 41.

[13] Колас Я. Яны пратэстуюць // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 81.

[14] Колас Я. Двадцать пять // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 325.

[15] Колас Я. Мужык // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 1. Вершы 1898—1917 гг. Мн., 1972. С. 160.

[16] Колас Я. Над чым працуем // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 229.

[17] Колас Я. Прамова на XXI з’ездзе Камуністычнай партыі Беларусі // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 233.

[18] Там жа. С. 232.

[19] Колас Я. Прамова на Трэцяй сесіі Акадэміі навук БССР // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 332.

[20] Там жа.

[21] Колас Я. Методыка роднай мовы // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 403.

[22] Колас Я. Быть гражданином // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 28.

[23] Колас Я. Прамова на XXI з’ездзе Камуністычнай партыі Беларусі. С. 233.

[24] Колас Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў. Пецярбург, 1910.

[25] Колас Я. На ростанях.

[26] Колас Я. Сымон-музыка // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 6. Паэмы “Новая зямля”, “Сымон-музыка”. Мн., 1974. С. 318.

[27] Колас Я. Задачы савецкай школы // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 41.

[28] Там жа. С. 42.

[29] Беларускі фальклор // Звязда. 1936, 27 снежня.

[30] Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. С. 312—318, 324—330.

[31] Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 26—30, 51—69, 272—274.

[32] Колас Я. Шануйце і любіце сваю родную мову // Колас Я. Збор твораў: у 14 т. Т. 12. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947—1956 гг. С. 26.

[33] Колас Я. На ростанях. С. 81.

[34] Колас Я. Шануйце і любіце сваю родную мову. С. 26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ